Партоліна М.І., магістрант БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Калацэй В.В.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

# СВЯТОЧНА-АБРАДАВЫ КОМПЛЕКС «КУПАЛЛЕ» НА ПАДЗВІННЕ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

*Купалле, Купала, Іван, Ян* – старажытная абрадавая ўрачыстасць, прымеркаваная да летняга сонцастаяння – найвышэйшага росквіту жыватворных сіл зямлі. У беларусаў, захавала ўсе прыкметы традыцыйнай народнай абраднасці і разам з тым хрысціянскага тлумачэння (у выніку пазнейшага наслаення на язычніцкі абрад хрысціянскай традыцыі свята прывязалася да дня Раства Іаана Хрысціцеля і пачало адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня, да гэтага – з 23 на 24 чэрвеня) [1, 266].

Змест купальскай абраднасці не быў аднолькавым для ўсіх часоў. Змяняліся ўмовы жыцця – і старыя традыцыі папаўняліся новымі. Такія традыцыі напластоўваліся адна на другую, стварая шматгранную функцыянальную сістэму прадстаўленняў.

Адным з найважнейшых момантаў Купалля выступала пакланенне сонцу (агню), вадзе і раслінасці. Кожны з гэтых культаў суправаджаўся цэлым шэрагам спецыфічных рытуальных дзеянняў.

З раніцы жанчыны і дзяўчаты ішлі на луг збіраць кветкі і зелкі, якія ў гэты дзень набываюць асаблівую гаючую сілу. Пасвечаныя ў царкве і засушаныя, яны потым служылі лекавымі сродкамі на цэлы год. Як адпавядае жыхарка в. Лыска Гарадоцкага раёна Грыбоўская Анастасія, «*перад Янам у цвяты бывала ходзюць, песні пяюць там, цвяты рвуць. А тады ў цэркву вязуць свяціць на Яна*» [2, 149]. Зелкі выкарыстоўвалі для розных жыццёвых патрэб. Лічылася, што яны зберагаюць дом ад стыхійных бедстваў, дапамагаюць пры хваробах. Таксама, з’яўляліся ахоўным сродкам ад чараўнікоў: крапіву-жычку, дзядоўнік падкладвалі пад дзверы хлявоў, торкалі ў сцены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На свята, дзяўчаты плялі вянкі з васілак, Івана-да-Мар’і, рамонкаў і іншых кветак і траў,а потым з імі варажылі або выкарыстоўвалі іх як ахоўны сродак ад ведзьм ці ад другой нечысці. Сярод купальскіх варожбаў на Падзвінне вылучаліся варожбы з вянкамі на вадзе і варожбы з вянкамі або травамі «на сон». *«Варажылі дзеўкі, цьвяты рвалі, пад галоўе клалі, загадачкі называюцца. Іх торкалі ў сцены і глядзелі, чыя загадка расцвіці, а чыя не зацвіціць. Загадывалі, калі замуж зайду ў гэтым гаду, то расцвіці, а калі не зайду, то ссохні. Загадачкі шышычкай такія, сівенькіе, многа-многа ў яе на шышачкі сучкоў. Загадывалі на іх, хто жыў будзіць»* (Марозава Аляксандра, в. Гары, Гарадоцкі раён) [2, 151].

Па усёй Беларусі святкаванне Купалля суправаджалася раскладаннем вогнішчаў. На Падзвінні для купальскіх агней выбіралі месцы на ўзвышшах, у лесе, каля вадаёмаў, на берагах рэк, у некаторых выпадках – на скрыжаванні дарог. На кастрах спальвалі ўсялякі хлам, сухія дрэвы і галінкі траецкага «мая». Акрамя кастроў на зямлі палілі колы і прасмоленыя бочкі, узнятыя ўверх на шастах і жардзінах, або уцягвалі іх на сухія дрэвы. Таксама спальвалі чучала, напханага саломай. У в. Гарані Гарадоцкага раёна раскладвалі агонь на скрыжаванні дарог. Паводле народных вераванняў, скрыжаванне дарог – места «нячыстае» і небяспечнае, а ў купальскую ноч асабліва, бо ў гэты час там маглі збірацца ведзьмы. Менавіта, купальскі агонь павінен быў атпудзіць нечысць.

Вогнішча распальвалі пасля захаду сонца, і вакол агню праводзіліся ўсе абрадавыя і гульнёвыя падзеі купальскай ночы. Магчыма адзначыць, што ў многіх месцах Падзвіння, у святкаванні Купалля, выразна выяўляюцца элементы маскараду. «*Перадзяваліся ў такую, што ведзьма ўжо ідзець, страшная, што яна будзець мальцам і дзеўкам паддзелываць. Адзежа была шырокая, страшная, доўгая. Як адзенемся да шчэ платок абвяжэм – як русалкі-пужалы. У жыта схаваецца русалка, а потым з жыта выскачыць, э-э-э… хто ў кусты, хто ў азяро плюх… Многа перадзяваліся, каб больш смяяліся…*» (Ліхаманава Ганна з в. Лялеўшчына Гарадоцкага раёна) [2, 154].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Верылі, што на купальскае вогнішча, могуць з’явіцца ведзьмы, часам ператорваныя ў тую, ці іншу жывёлу (калі нейкая істота выклікала падазрэнне, ёй наносілі калецтва, каб пазнаць потым – хто гэта вядзьмарыць). Ад ведзьмаў, якія робяць заломы у жыце, заезджаюць коней і адбіраюць малако ў кароў, вывешвалі над дзвярыма хатаў, хлявоў розныя абярэгі – сярпы, іголкі, косы, крапіву і г.д.

Уяўленні пра папараць-кветку, якая расцітае раз у год у купальскую ноч, характэрны для ўсяго Падзвіння. Казалі, хто яе знойдзе, будзе разумець мову птушак і жывёл, будзе ведаць месцазнаходжанне заклятых скарбаў, зможа прадбачыць будучыню. Як спавядала Мажурова Вольга з в. Маскаляняты Гарадоцкага раёна, «*нада было сцяречь у якое ўремя: у палуначі там, ілі ў сколькі папараць-кветка далжна зацвісь. І нада было тот цвяток сарваць абязацельна. Но было небезапасна… вот тожа бабушка как-та расказывала, што адзін <чалавек> цвяток сарваў, разрезаў кожу на ладоні і цвяток той улажыў туды. І ўжо мог ўсё знаць, усё відзець. Так яго преследавалі духі нячыстыя. І ўсё роўна ўнічтожылі ані яво…*». На папараці таксама варажылі. «*Прінасілі папараць ету дамоў, тады ставілі яе за зерькала, ну і садзіліся – прійдзець суджаны. І ніхто не выседжваў. Как двенаццаць часоў, так баяцца, разбягаюцца*» (Буряк Клаўдзія з в. Бычыха Гарадоцкага раёна) [2, 155].

Пад раніцу хлопцы і дзяўчаты купаліся ў рацэ, качаліся па купальскай расе, каб набрацца ад яе моцы, а потым сустракалі ўсход сонца, якое, падымаючыся, «іграе», «купаецца» (у народзе лічылася, што толькі два разы ў год сонца на ўзыходзе «грае» – на Вялікдзень і на Купалу).

Асаблівую роль у традыцыйным свяце адыгрывала песня. Паводле функцыянальна-тэматычнага прынцыпу, купальскія песні дзяліліся на некалькі груп:

1. Песні пачатковага перыяду купалля:
   а) песні, што суправаджалі збор зёлак;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

b) песні, у якіх выражалася просьба добрай пагоды для купальскага гуляння;

c) купалкі, што заклікалі моладзь ісці на гулянне;

d) песні, звернутыя да сонца, месяца, купальніцы з просьбай раскласці агонь.

2. Песні і карагоды, што выконваліся каля купальскага вогнішча:

   a) песні, звернутыя да Купалы, Купалінкі;

   b) жартоўныя песні, у якіх агулам высмейваліся хлопцы і дзяўчаты свайго сяла;

   c) песні, што высмейвалі дзяўчат суседняга сяла;

   d) песні, якія высмейвалі недахопы паасобных хлопцаў і дзяўчат.

3. Купальскія песні аграрнага зместу.
4. Купалкі любоўнай і сямейнай тэматыкі.
5. Купальскія балады.

Але фактычна ў паэзіі Купалля тых часоў дамінавалі дзве тэмы. Адна нясла ў сабе адвечны клопат земляробства аб хлебе, аб будучым ураджаі, заўтрашнім дні. Другая выказвала свет інтымных перажыванняў: каханне, заляцанне, імкненне да асабістага шчасця.

Усе гэты этнаграфічныя апісанне падзвінскага купалля датычыцца да 19 - пачатку 20 стагоддзя. Купальская традыцыя ў той час яшчэ актыўна бытавала. Аднак са знікненнем практычнай яе абумоўленнасці, вытворча-магічнага сэнса многія купальскія абрады забываліся і паступова знікалі з народнага ужытку. У іх захавалася толькі то, што мела эстэтычную каштоўнасць: гульнявыя моманты, яркія, вясёлыя дэталі пераасэнсаванага абраду. Пры гэтым спрадвечныя моманты абраднасці, захаваўшы толькі свой знешні, фармальны бок, страчвалі змястоўна-паняційны. Так, па сенняшні дзень на Падзвінне бытуе звычай распальвання купальскіх вогнішчаў. Яшчэ больш жывучай аказалась традыцыя жартоўных купальскіх бясчынстваў. У гэту ноч не асуджаецца і даруюцца любыя свавольства. Захавалася і традыцыя купальскіх “масак”: дзеці пэцкаюць твары сажай, прырабляюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рогі, хвасты, прыклейваюць бароды з лубу, уяўляя сабой чарцей, пераапранаюцца ў мядзведзей, ведзьмакоў і г.д.

Купальская песенная традыцыя таксама змянілася. Песні, губляя сувязь з каменціраваннем абрадавага дзеяння, пераходзілі ў разрад лірычных, падчас захоўвая толькі далёкую сувязь з самім абрадам. Магчыма, гэта з’ява вытлумачваецца спецыфічным узроставым распластаваннем. Таму, што традыцыйныя абрады падтрымліваюцца дзецьмі, падлеткамі і моладдзю дашлюбнага перыяду, носьбітамі песеннай купальскай традыцыі з’яўляюцца выключна жанчыны сярэдняга ўзросту і ў гадах. Мабыць і таму, найбольш жыццяздольнымі аказаліся песні, якія заключалі ў сабе элементы бытавой лірыкі ці маглі быць пераасэнсаваны ў гэтым напрамку. Купальская песня стала пераходзіць ад выяўлення канкрэтных абрадавых дзействаў да перадачы ўнутранага міру чалавека і змыкацца як па тэматыкі тэкстаў, так і па некаторым характырыстыкам тыповых напеваў з песнямі неабрадавымі, лірычнымі. Гэтым, напэўна, і тлумачыцца яе здольнасць значна перажываць адпаведную абраднасць і захоўвацца ў памяці народа нават пры поўным знікненні абраднай традыцыі.

На прыканцы, трэба адзначыць, што падзвінская купальская святочнасць і адпаведныя ёй песні актыўна жывуць у народным быце і таму выступаюць часткай сучаснай народнай культуры. Светапоглядныя асновы купальскай абрадавай традыцыі незваротна забыты, аднак асобныя яе мастацкія праяўленні сучасны і сёння, паколькі валодаюць высокай эстэтычнай значнасцю, паколькі немалае месца належыць тут і рацыянальным, пазітыўным момантам.

У апошні час на Падзвінні назіраюцца спробы пераасэнсаваць старажытную абрадавую традыцыю, цясней звязаць яе з сучаснасцю. Таму традыцыйныя народныя святы могуць стаць важным звяном сучаснага грамадства і не толькі ў яго эстэтычным выхаванні.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько і інш. – 2-ое выд., дап. Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.: іл.

2. Варфаламеева Т. Б. Віцебскае Падзвінее/ Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. //Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш. – Мн.: Бел. навука, 2004. Т. 2 – 910с.

3. Ліс А. С. Купальскія і пятроўскія песні/ А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч; муз. Часткі Г. В. Таўлай; Рэд. А. С. Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 631 с., нот. іл.

4. Тавлай, Г. В. Белорусское купалье: Обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1986. – 174 с.: ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ